ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ

Аб’ект аўтарскага права
УДК 821.161.3.09 (092) (043.3)

ЛАЎРЫК
Таццяна Анатольеўна

# ЭВАЛЮЦЫЯ ТВОРЧАЙ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦІ ЛЕАНІДА ДАЙНЕКІ Ў КАНТЭКСЦЕ МАСТАЦКАГА ГІСТАРЫЗМУ

Аўтарэферат
дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук
па спецыяльнасці 10.01.01 – беларуская літаратура

Мінск, 2026

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Навуковая работа выканана ў Беларускім дзяржаўным універсітэце

| | |
|---|---|
| **Навуковы кіраўнік** | **Бельскі Аляксандр Іванавіч**, доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта |
| **Афіцыйныя апаненты** | **Тарасава Тамара Мікалаеўна**, доктар філалагічных навук, прафесар, прафесар кафедры беларускай і замежнай літаратуры УА «Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка» |
| | **Шаладонаў Ігар Міхайлавіч**, кандыдат філалагічных навук, дацэнт, вядучы навуковы супрацоўнік аддзела беларускай літаратуры XX і XXI стст. ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі» |
| **Апаніруючая арганізацыя** | УА «Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова» |

Абарона адбудзецца «10» красавіка 2026 г. у 12.00 на пасяджэнні савета па абароне дысертацый Д 02.01.12 пры Беларускім дзяржаўным універсітэце па адрасе: 220030, г. Мінск, вул. К. Маркса, 31, філалагічны факультэт, аўд. 62; e-mail вучонага сакратара: tsidorova1980@mail.ru, тэл.: 209-55-58.

З дысертацыяй можна азнаёміцца ў Фундаментальнай бібліятэцы Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Аўтарэферат разасланы «_9_» сакавіка 2026 г.

Вучоны сакратар савета
па абароне дысертацый Т.П.Сідарава

# УВОДЗІНЫ

У канцы XX – пачатку XXI ст. узмацнілася ўсведамленне каштоўнасці ведаў пра мінулае, што абумоўлена разуменнем фундаментальнай ролі гістарычных падзей у фарміраванні сучаснасці. Гісторыя разглядаецца як значны фактар, які ўплывае на грамадскую самасвядомасць і сацыякультурныя працэсы. У сувязі з гэтым выключнае значэнне мае мастацкая літаратура, якая ўзнаўляе мінулае ў гістарычных карцінах, сюжэтах і вобразах.

Гістарычны раман сёння з'яўляецца адным з вядучых літаратурных жанраў, які характарызуе ідэйна-мастацкі ўзровень развіцця літаратуры, яе сталасці, эстэтычнай прэзентабельнасці. Нягледзячы на багатую гісторыю гістарычнага рамана ў XIX ст. (В. Гюго, Ч. Дзікенс, А. Дзюма, Ф. Купер, В. Скот, Л. Талстой, А. Франс і інш.), перыяд яго інтэнсіўнага развіцця і значных мастацкіх дасягненняў прыпадае на XX ст., калі назіраўся надзвычайны феномен уздыму гістарычнай раманістыкі, што пацвярджаецца, у першую чаргу, творчасцю пісьменнікаў еўрапейскіх краін. У XX ст. да тэмы гістарычнага мінулага звярталіся Г. Абашыдзэ, В. Астаф'еў, Б. Васільеў, Д. Балашоў, Д. Дзімаў, А. Дончаў, С. Жаромскі, П. Заграбельны, Я. Івашкевіч, Л. Кастэнка, В. Катаеў, М. Лаліч, І. Марэк, В. Пікуль, М. Садавяну, Э. Станеў, Д. Талеў, А. Талстой, Ю. Трыфанаў, Й. Томан, А. Чапыгін, В. Ян і інш.

На працягу XX–XXI стст. у літаратурным працэсе Беларусі назіраліся прыкметныя змены, якія ўплывалі на ўзмацненне цікавасці да нацыянальнага мінулага, пачынаючы ад перыяду станаўлення гістарычнай прозы (В. Ластоўскі, М. Гарэцкі, Я. Дыла, Б. Мікуліч і інш.) і да яе інтэнсіўнага фарміравання і развіцця (У. Караткевіч, Я. Сіпакоў, Г. Далідовіч, К. Тарасаў, А. Лойка, В. Коўтун, І. Клаз, С. Зайцаў, Л. Рублеўская, А. Бутэвіч, З. Дудзюк, В. Чаропка, А. Марціновіч, Н. Голубева, А. Бензярук, Я. Конеў, І. Саверчанка, У. Мажылоўскі, А. Брытун і інш.). Сярод найбольш значных і рэпрэзентатыўных пісьменнікаў гістарычнай тэмы другой паловы XX – пачатку XXI ст. вылучаецца Леанід Дайнека (1940–2019), аўтар шырока вядомага цыкла гістарычных раманаў «Меч князя Вячкі», «След ваўкалака», «Жалезныя жалуды» і інш. Ён – лаўрэат Літаратурнай прэміі імя Івана Мележа (1988), Дзяржаўнай прэміі БССР (1990), прэміі імя Валянціна Пікуля (2010). Пісьменнік вывеў беларускі гістарычны раман на новы ўзровень; грамадскае прызнанне і чытацкую запатрабаванасць яго твораў можна патлумачыць майстэрствам распрацоўкі сюжэта, дынамічнай і займальнай наратыўнай манерай, сінтэзам рэалістычнага і рамантычнага пачаткаў, арганічным спалучэннем дакументальнасці з мастацкім вымыслам, уключэннем прыгодніцкіх элементаў і псіхалагічнай дакладнасцю ў раскрыцці характараў герояў.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Апрача навуковых вынікаў праведзенае даследаванне будзе мець практычную каштоўнасць, паколькі творы Л. Дайнекі ўключаны ў змест адукацыйных праграм устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Творчая індывідуальнасць і літаратурныя дасягненні Л. Дайнекі заслугоўваюць паглыбленага аналізу і вымагаюць правядзення асобнага сістэмнага літаратуразнаўчага даследавання, што падкрэслівае **актуальнасць дысертацыйнай работы**.

## АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

**Сувязь работы з навуковымі праграмамі (праектамі), тэмамі**

Даследаванне эвалюцыі творчай індывідуальнасці Леаніда Дайнекі ў кантэксце мастацкага гістарызму адпавядае асноўным кірункам навуковай працы кафедры гісторыі беларускай літаратуры філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта і выканана ў межах навукова-даследчай тэмы «Беларуская літаратура XI–XXI стст.: станаўленне і эвалюцыя жанраў» (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, № ДР 20212928, тэрмін выканання 2021–2025 гг.), загад рэктара БДУ ад 21.06.2021, № НДР-304.

**Мэта і задачы даследавання**

***Мэта*** даследавання – на аснове сістэмна-комплекснага аналізу гістарычнай прозы Л. Дайнекі прасачыць станаўленне і эвалюцыю творчай індывідуальнасці пісьменніка ў кантэксце мастацкага гістарызму.

Навуковая рэалізацыя мэты даследавання прадугледжвае пастаноўку і вырашэнне наступных ***задач***:

– вызначыць заканамернасці і асаблівасці станаўлення творчай індывідуальнасці Л. Дайнекі ў аспекце фарміравання мастацкага гістарызму ў прозе пісьменніка;

– акрэсліць асноўныя этапы развіцця гістарычнай праблематыкі ў творчасці Л. Дайнекі ў сувязі з выпрацоўкай і ўдасканаленнем яго аўтарскай стратэгіі;

– раскрыць ідэйна-мастацкую спецыфіку ўвасаблення праблематыкі і жанравай адметнасці гістарычнай прозы Л. Дайнекі другой паловы XX – пачатку XXI ст.;

– паказаць наватарскі характар аўтарскіх стратэгій і выявіць з’яўленне новых мастацкіх элементаў у творах Л. Дайнекі пачатку XXI ст.;

– абгрунтаваць прынцыпы тыпізацыі і псіхалагічнай індывідуалізацыі вобразаў гістарычных асоб у раманах Л. Дайнекі.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

**Аб'ект і прадмет даследавання**

***Аб'ектам*** даследавання дысертацыйнай работы з'яўляюцца паэтычныя і празаічныя творы Л. Дайнекі, якія садзейнічалі станаўленню мастацкага гістарызму і раманнай формы ў творчасці пісьменніка. Сярод іх: гісторыка-рэвалюцыйная дылогія «Людзі і маланкі», «Запомнім сябе маладымі», раман «Футбол на замініраваным полі», цыкл гістарычных раманаў «Меч князя Вячкі», «След ваўкалака», «Жалезныя жалуды»; раманы пачатку XXI ст.: «Назаві сына Канстанцінам», «Ілоты»; мініяцюры «Герадоцінкі».

***Прадмет*** даследавання – этапы станаўлення і эвалюцыі творчай індывідуальнасці Л. Дайнекі ў кантэксце яго аўтарскай стратэгіі мастацкага паказу і асэнсавання мінулага.

**Метады даследавання**

Выбар метадалогіі абумоўлены мэтамі і задачамі даследавання. Выкарыстаны наступныя метады: сістэмна-комплексны, біяграфічны, структурнага аналізу, параўнальна-тыпалагічны, гісторыка-храналагічны і культурна-гістарычны.

**Навуковая навізна даследавання**

Дысертацыя з'яўляецца першым у беларускім літаратуразнаўстве гісторыка-храналагічным і сістэмна-комплексным даследаваннем творчай індывідуальнасці Л. Дайнекі ў аспекце фарміравання мастацкага гістарызму ў сучаснай беларускай літаратуры: абгрунтавана сцверджаны працэс жанрава-стылёвай эвалюцыі, мадэрнізацыйных тэндэнцый у творах пісьменніка XX – пачатку XXI ст., вылучана і ахарактарызавана іх мастацкая навізна, адметнасць і высокая мастацкая вартасць.

Упершыню вызначаны асноўныя этапы станаўлення гістарычнай тэматыкі і праблематыкі ў творчасці Л. Дайнекі, акрэслены тэндэнцыі да пашырэння жанрава-тэматычных межаў яго раманнай прозы; з гэтай мэтай прааналізаваны яго асобныя творы XXI ст., якія не атрымалі сістэмнага аналізу ў беларускім літаратуразнаўстве.

Упершыню падрыхтаваны поўныя бібліяграфічныя спісы, якія адлюстроўваюць жыццёвы і творчы шлях Л. Дайнекі і з'яўляюцца каштоўным інструментам для цэласнага даследавання і вывучэння творчасці пісьменніка.

**Палажэнні, якія выносяцца на абарону**

1. Гістарычная проза ў літаратурным працэсе Беларусі канца XX – пачатку XXI ст. займае асабліва прыкметнае і важнае месца; у гэтым кантэксце творчасць пісьменніка-раманіста Л. Дайнекі вылучаецца мастацкай самабытнасцю і канцэптуальнай глыбінёй, а таксама значным укладам у развіццё нацыянальнай гістарычнай прозы. Аўтар па праве лічыцца адным з найбольш яркіх прадстаўнікоў беларускай гістарычнай прозы, з'яўляецца творчым пераемнікам і таленавітым прадаўжальнікам мастацкіх традыцый Уладзіміра Караткевіча, які

запачаткаваў школу гістарычнай прозы ў беларускай літаратуры XX ст. Станаўленне і эвалюцыя творчай індывідуальнасці, паэтыкі і стылю Л. Дайнекі ў аспекце мастацкага гістарызму адбываліся на працягу трох этапаў творчасці, у межах якіх проза пісьменніка зведала значную праблемна-тэматычную эвалюцыю: ад звароту да гісторыка-рэвалюцыйнай тэмы, мастацкага асваення сярэднявечнай беларускай гісторыі да пашырэння хранатопу і паглыблення гістарычнай праблематыкі ў яго раманным эпасе.

2. Леанід Дайнека сцвердзіў сябе як арыгінальны аўтар, які істотна пашырыў жанравыя магчымасці гістарычнага рамана і зрабіў унёсак у развіццё беларускай гістарычнай літаратуры. Пачатак фарміравання мастацкай стратэгіі аўтара прыпадае на 1960-я гг., калі Л. Дайнека ўпершыню выступіў з паэтычнымі творамі, у т.л. гістарычнай тэматыкі. У 1970-я гг. пісьменнік звяртаецца да празаічных твораў: гісторыка-рэвалюцыйнай дылогіі («Людзі і маланкі», «Запомнім сябе маладымі») і рамана з рэтраспекцыяй да падзей Вялікай Айчыннай вайны («Футбол на замініраваным полі»). Яны сталі важным этапам у авалоданні раманным мысленнем, подступам да мастацкага ўвасаблення праблематыкі на гістарычным матэрыяле аддаленага часу. Беларуская літаратура 1970-х гг. характарызуецца памкненнем да інтэнсіўнага мастацка-філасофскага асэнсавання рэчаіснасці ў яе рэтраспекцыі, у сувязі з чым дасягненні нацыянальнай прозы істотна паўплывалі на эпас Л. Дайнекі і яго пошук аўтарскай творчай стратэгіі. У гэты час ён звяртаецца да праблемы самавызначэння беларусаў, якая на той момант у літаратуры заставалася неакрэсленай.

3. У перыяд галоснасці і сацыякультурнай трансфармацыі грамадства ў беларускай літаратуры асаблівую значнасць набывае праблематыка самаідэнтыфікацыі, захавання нацыянальнай самабытнасці і духоўна-маральных каштоўнасцей асобы. Гэтыя тэндэнцыі абумоўліваюць тэматычную арыентацыю прозы Л. Дайнекі, якая сканцэнтравана на мастацкім адлюстраванні і аналітычным асэнсаванні гісторыі Беларусі. Цыкл раманаў другой паловы 1980-х – 1990-х гг. («Меч князя Вячкі», «След ваўкалака», «Жалезныя жалуды») стаў важным этапам у творчай эвалюцыі пісьменніка і яго значным дасягненнем ў рэпрэзентацыі далёкага мінулага. Мастацкая інтэрпрэтацыя падзей у творах накіравана на раскрыццё спецыфікі эпохі, псіхалагічную распрацоўку і тыпізацыю герояў, што дазваляе асэнсаваць гістарычны досвед і актуалізаваць сацыяльна-духоўныя праблемы. У раманах па-мастацку ўвасоблены канфлікт паміж хрысціянствам і язычніцтвам, што дазваляе аўтару паказаць сутыкненне светапоглядаў і перадаць складанасць гістарычнага выбару. Пісьменнік апелюе да асобных аспектаў паэтыкі рыцарскага рамана, творча трансфармуючы іх у межах беларускага гістарычнага досведу і надаючы творам адметную

нацыянальную спецыфіку. «Меч князя Вячкі», «След ваўкалака», «Жалезныя жалуды» сведчаць пра высокі ўзровень авалодання аўтарам эпічнай формай і жанравай структурай гістарычнага рамана.

4. У літаратурным працэсе незалежнай Беларусі пачатку XXI ст. творчасць Л. Дайнекі характарызуецца прыкметнымі эвалюцыйнымі трансфармацыямі. Мастацка-вобразнае і хранатопнае мысленне пісьменніка пашыраецца ў кантэксце новага маштабнага дыскурсу, арыентаванага на мастацкае асваенне нацыянальнай гісторыі. У рамках новай культурна-часавай парадыгмы ён пераасэнсоўвае свае аўтарскія стратэгіі, накіраваныя на інтэграцыю традыцыйных і наватарскіх элементаў і пошук новых спосабаў мастацкага асваення нацыянальнай гісторыі. Раманныя тэксты Л. Дайнекі гэтага перыяду дэманструюць яго імкненне да жанравай поліфаніі і выступаюць як сінтэтычныя структурныя мадэлі, у якіх інтэгруюцца элементы розных празаічных жанраў – рыцарскага і авантурна-прыгодніцкага раманаў, гістарычнага дэтэктыва, інтэлектуальнай прозы, фантастыкі, фэнтэзі і інш. Гісторыка-рэлігійная праблематыка выступае адной з ідэйна-тэматычных дамінант у творчасці пісьменніка, яна непасрэдна карэлюе з яго асабістым стаўленнем да рэлігіі і сведчыць пра зацікаўленне гісторыяй хрысціянства і працэсамі фарміравання ўласнай веры. У гістарычнай прозе пісьменніка выразна акрэсліліся тэндэнцыі да пашырэння праблемна-тэматычнага поля і жанрава-стылёвай парадыгмы. Праблематыка гістарычных раманаў на новым этапе абумовіла іх пафас, жанравую спецыфіку і мастацкія навацыі. Творы «Назаві сына Канстанцінам», «Ілоты» вылучаюцца арыгінальным аўтарскім бачаннем і інтэрпрэтацыяй даўніх падзей. Мініяцюры «Герадоцінкі», найперш мастацкія замалёўкі, гістарычныя рэфлексіі, аўтабіяграфічныя запісы, нібы, дадаючы яскравыя штрыхі, дапаўняюць творчы партрэт пісьменніка Л. Дайнекі, які звяртаецца да далёкага мінулага, буйнога гістарычнага раманіста і мысляра-інтэлектуала, гавораць пра яго глыбокую дасведчанасць у нацыянальнай і сусветнай гісторыі.

5. Раманы Л. Дайнекі вызначаюцца арыгінальнасцю, канцэптуальнасцю, панарамнасцю і шырынёй ахопу матэрыялу. Стварэнне рамантычнага вобраза нацыянальнага героя – асноўнае ў ідэйным змесце гістарычных твораў пісьменніка. Увасабленне гэтага вобраза, ідэйнае напаўненне твораў абумоўліваюць і мастацкую манеру, стылістычныя асаблівасці прозы Л. Дайнекі. Адметнымі рысамі індывідуальна-аўтарскага стылю пісьменніка з’яўляюцца апавядальніцкі дынамізм, выкарыстанне народна-бытавых дэталей, фальклорных і міфічных элементаў, зварот да лірызму і інш. Празаічныя творы Л. Дайнекі пачатку XXI ст. – структурныя мадэлі сінтэтычнага тыпу; яго гістарычную прозу варта разглядаць як арыгінальную, высокамастацкую і самабытную з’яву.

**Асабісты ўклад саіскальніка**

Дысертацыйная работа з’яўляецца самастойным даследаваннем, публікацыі па тэме выкананы без суаўтараў і адлюстроўваюць асабісты ўклад саіскальніка ў асэнсаванне творчасці Л. Дайнекі ХХ–ХХІ стст. У дысертацыі выкарыстаны ўнікальныя матэрыялы з асабістага архіва даследчыка – перапіска з пісьменнікам, а таксама інфармацыя, атрыманая ад яго родных, што забяспечвае дадатковую дакументальную і біяграфічную глыбіню даследавання. У дадатках да дысертацыі прадстаўлена храналогія вывучэння творчасці Л. Дайнекі (год смерці пісьменніка – 2019) у выглядзе поўных бібліяграфічных спісаў, складзеных упершыню.

**Апрабацыя дысертацыі і інфармацыя аб выкарыстанні яе вынікаў**

Палажэнні і вынікі дысертацыі абмяркоўваліся на пасяджэнні кафедры тэарэтычнага і беларускага літаратуразнаўства філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта 30.04.2025. Асноўныя навуковыя прамежкавыя і канчатковыя вынікі даследавання былі прадстаўлены на 16 рэспубліканскіх і міжнародных (у тым ліку 1 замежнай) навуковых і навукова-практычных канферэнцыях: V Міжнародных Скарынаўскіх чытаннях, прысвечаных 500-годдзю беларускага кнігадрукавання (17–18 лістапада 2017 г., Мінск); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларуская гістарычная літаратура: жанры, характары, праблемы: да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага» (22–23 сакавіка 2018 г., Мінск); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі. Да 220-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча» (21–23 чэрвеня 2018 г., Мінск); XVI Міжнародных кнігазнаўчых чытаннях, прысвечаных 500-годдзю заснавання Жыровіцкага манастыра і бібліятэкі (15 мая 2020 г., Мінск); ІІ Міжнародным навуковым кангрэсе беларускай культуры (10 верасня 2020 г., Мінск); Міжнароднай канферэнцыі «Волинська книга: історія, дослідження, колекціонування» (11 снежня 2020 г., Астрог (Украіна)); Навукова-практычным семінары «Шляхамі маладнякоўцаў», прысвечаным 135-годдзю Змітрака Бядулі і 120-годдзю М. Зарэцкага (27 студзеня 2021 г., Мінск); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларуская літаратура і літаратуразнаўства: канцэпцыі, напрамкі, навуковыя школы»: да 90-годдзя з дня заснавання Інстытута літаратуразнаўства НАН Беларусі (1 красавіка 2021 г., Мінск); 78-й навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў БДУ (22 красавіка 2021 г., Мінск); XIII Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай: да 100-годдзя БДУ і 90-годдзя з дня нараджэння А. А. Лойкі» (29–30 кастрычніка 2021 г., Мінск); VII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край» (25 лістапада 2021 г., Віцебск); XVIII Міжнародных кнігазнаўчых чытаннях (28–29 красавіка 2022 г.,

Мінск); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «Беларуская літаратура на сучасным этапе: аўтар, герой, чытач», прысвечанай 85-годдзю з дня нараджэння акадэміка У. В. Гніламедава (21–22 снежня 2022 г., Мінск); Міжнароднай навуковай канферэнцыі «“Высокія арбіты грамадзянскасці”: гісторыя, лёс, асобы: да 80-годдзя члена-карэспандэнта НАН Беларусі С. С. Лаўшука» (30–31 ліпеня 2024 г., Мінск); X навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край» (21–22 лістапада 2024 г., Віцебск); Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі «Сучасная беларуская літаратура: праблемы, напрамкі, стылі», прысвечанай 90-годдзю паэта, ганаровага акадэміка НАН Беларусі В. Зуёнка (18 чэрвеня 2025 г., Мінск).

**Апублікаванасць вынікаў дысертацыі**

Асноўныя вынікі даследавання па тэме дысертацыі прадстаўлены ў 22 публікацыях, сярод якіх: 6 артыкулаў – у рэцэнзаваных часопісах, рэкамендаваных ВАК (3,24 аўт. арк.); 6 артыкулаў – у навуковых зборніках (2,08 аўт. арк.); 10 артыкулаў – у матэрыялах канферэнцый (3,63 аўт. арк.). Агульны аб’ём апублікаваных матэрыялаў складае 8,95 аўтарскага аркуша.

**Структура і аб’ём дысертацыі**

Агульны аб’ём дысертацыі складае 171 старонку: асноўны тэкст даследавання – 103 старонкі, бібліяграфічны спіс – 26 старонак (спіс выкарыстаных крыніц – 268 пазіцый, спіс публікацый саіскальніка – 22 пазіцыі). У дадатках да дысертацыі змешчаны бібліяграфічныя спісы, якія адлюстроўваюць храналогію вывучэння і публікацыі твораў Л. Дайнекі, – 42 старонкі.

## АСНОЎНЫ ЗМЕСТ ДЫСЕРТАЦЫІ

У працы прадстаўлены **«Аналітычны агляд літаратуры па тэме дысертацыйнага даследавання»**, у якім разглядаецца станаўленне мастацкага гістарызму, этапы даследавання фарміравання беларускай гістарычнай прозы і жанру гістарычнага рамана. Зроблены акцэнт на працах Г. Лукача, Г. Батэрфілда, А. Кашынцава. Падкрэсліваецца, што ў другой палове XX ст. да праблемы гістарычнай прозы, жанру гістарычнага рамана звярталіся савецкія літаратуразнаўцы С. Пятроў, А. Пауткін, В. Аскоцкі, Л. Аляксандрава, Г. Ленобль, І. Варфаламееў, І. Шчаблыкін, А. Гулыга і інш. Беларуская проза пра далёкае і блізкае мінулае знаходзіцца ў зоне павышанай увагі літаратуразнаўства канца XX – пачатку XXI ст. Важнае метадалагічнае значэнне для дасягнення мэт дысертацыі маюць даследаванні айчынных навукоўцаў: Д. Бугаёва, А. Вераб’я, Т. Камароўскай, М. Тычыны, С. Андраюка, Л. Прашковіч, В. Шынкарэнка, А. Русецкага, Я. Гарадніцкага, В. Локун, Т. Грамадчанка, Г. Ішчанка, А. Дарагакупец, І. Дамарад, А. Лапата-Загорскага і інш. Несумненную

## СПІС ПУБЛІКАЦЫЙ САІСКАЛЬНІКА ВУЧОНАЙ СТУПЕНІ

**Артыкулы ў рэцэнзаваных выданнях, рэкамендаваных ВАК**

1–А. Лаўрык, Т. Актуалізацыя гісторыі ў прозе Леаніда Дайнекі / Т. Лаўрык // Полымя. – 2020. – № 6. – С. 91–96.

2–А. Лаўрык, Т. А. Гістарычная проза Леаніда Дайнекі: актуальныя аспекты вывучэння / Т. А. Лаўрык // Беларуская мова і літаратура. – 2022. – № 3. – С. 33–40.

3–А. Лаўрык, Т. Дакументальныя матэрыялы ў даследаванні творчасці пісьменніка Леаніда Дайнекі / Т. Лаўрык // Роднае слова. – 2023. – № 4. – С. 24–26.

4–А. Лаўрык Т. Гісторыка-рэвалюцыйны раман у творчасці Леаніда Дайнекі: дылогія «Людзі і маланкі», «Запомнім сябе маладымі» / Т. Лаўрык // Полымя. – 2024. – № 3. – С. 77–82.

5–А. Лаўрык, Т. «Святло новай веры»: гісторыка-рэлігійная праблематыка ў рамане «Назаві сына Канстанцінам» Леаніда Дайнекі / Т. Лаўрык // Роднае слова. – 2025. – № 1. – С. 12–15.

6–А. Лаўрык, Т. А. Станаўленне і развіццё жанру гістарычнага рамана ў творчасці Леаніда Дайнекі / Т. А. Лаўрык // Беларуская мова і літаратура. – 2025. – № 4. – С. 53–59.

**Артыкулы ў навуковых зборніках**

7–А. Лаўрык, Т. Вячаслаў Адамовіч (Дзяргач): рэальная асоба і яе мастацкае ўвасабленне ў рамане Л. Дайнекі «Ілоты» / Т. Лаўрык // Здабыткі : дакумент. помнікі на Беларусі / Нац. б-ка Беларусі ; склад.: Т. А. Сапега [і інш.] ; рэдкал.: Р. С. Матульскі (гал. рэд.) [і інш.]. – Мн., 2021. – Вып. 24. – С. 269–280.

8–А. Лаўрык, Т. А. Гістарычная праблематыка ў творчасці Леаніда Дайнекі: пошук новых падыходаў / Т. А. Лаўрык // Традыцыі і сучасны стан культуры і мастацтваў : зб. навук. арт. / НАН Беларусі, Цэнтр даслед. бел. культуры, мовы і літ. – Мн., 2022. – Вып. 3 : Матэрыялы другога Міжнароднага навуковага кангрэса беларускай культуры, 10 верасня 2020 г., г. Мінск / рэдкал.: А. І. Лакотка (гал. рэд.) [і інш.]. – С. 454–457.

9–А. Лаўрык, Т. А. Гераічнае мінулае ў рамане Леаніда Дайнекі «Меч князя Вячкі» / Т. А. Лаўрык // Беларуская літаратура і літаратуразнаўства : зб. навук. арт. : да 90-годдзя Ін-та літаратуразнаўства / НАН Беларусі [і інш] ; уклад. Н. В. Якавенка ; навук. рэд. І. В. Саверчанка. – Мн., 2022. – С. 324–327.

10–А. Лаўрык, Т. А. Жанрава-стылёвая спецыфіка мініяцюр «Герадоцінкі» Леаніда Дайнекі / Т. А. Лаўрык // Беларуская літаратура на сучасным этапе: аўтар, герой, чытач: да 85-годдзя з дня нараджэння акадэміка У. В. Гніламедава :

[па выніках Міжнар. навук. канф., 21–22 снеж. 2022 г., Мінск] : зб. навук. арт. / НАН Беларусі, Цэнтр даслед. бел. культуры, мовы і літ., Ін-т літаратуразнаўства ; уклад. К. В. Часнакова. – Мн., 2023. – С. 232–236.

11–А. Лаўрык, Т. Мастацкая канцэпцыя вобраза князя Міндоўга ў рамане Леаніда Дайнекі «Жалезныя жалуды» / Т. Лаўрык // Маладая плынь : навук. і літ. альм. каф. гісторыі бел. літ. БДУ / Бел. дзярж. ун-т ; рэдкал.: А. Бельскі (гал. рэд. і ўклад.) [і інш.]. – Мн., 2023. – Вып. 2. – С  59–62.

12–А. Лаўрык, Т. А. Маральна-этычная праблематыка і асэнсаванне вайны ў рамане Л. Дайнекі «Футбол на замініраваным полі» / Т. А. Лаўрык // «Высокія арбіты грамадзянскасці»: гісторыя, лёс, асоба : (да 80-годдзя членакарэспандэнта НАН Беларусі С. С. Лаўшука) : [па выніках Міжнар. навук. канф., 30–31 ліп. 2024 г., Мінск] : зб. навук. арт. / НАН Беларусі, Цэнтр даслед. бел. культуры, мовы і літ, Ін-т літаратуразнаўства ; уклад. А. А. Бараноўскі. – Мн., 2025. – С. 219–224.

**Матэрыялы навуковых канферэнцый**

13–А. Лаўрык, Т. А. Сучаснік Францыска Скарыны – гетман Канстанцін Астрожскі ў мастацкай інтэрпрэтацыі Л. Дайнекі (паводле рамана «Назаві сына Канстанцінам») / Т. А. Лаўрык // Асоба і творчая спадчына Францыска Скарыны: рэцэпцыя і інтэрпрэтацыя : матэрыялы V Міжнар. Скарын. чытанняў, прысвеч. 500-годдзю бел. кнігадрукавання (17–18 лістап. 2017 г., Мінск) / Бел. дзярж. ун-т. ; рэдкал.: А. І. Бельскі [і інш.]. – Мн., 2017. – С. 201–207.

14–А. Лаўрык, Т. А. «Час мяняе арыенціры» : жанравая эвалюцыя гістарычнай прозы Л. Дайнекі / Т. А. Лаўрык // Беларуская гістарычная літаратура: жанры, характары, праблемы: да 125-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага : матэрыялы Міжнар. навук. канф. (Мінск, 22–23 сак. 2018 г.) / НАН Беларусі, Цэнтр даслед. бел. культуры, мовы і літ., Ін-т літаратуразнаўства ; уклад. А. А. Манкевіч ; навук. рэд. С. С. Лаўшук. – Мн., 2018. – С. 243–249.

15–А. Лаўрык, Т. Адлюстраванне эпохі праўлення Жыгімонта III Вазы ў рамане Л. Дайнекі «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка» / Т. Лаўрык // Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі: да 220-годдзя з дня нараджэння Адама Міцкевіча : зб. арт. па матэрыялах міжнар. навук. канф., [Мінск, 21–23 чэрв. 2018 г.] / Міжнар. асац. беларусістаў [і інш.] ; пад рэд. І. Э. Багдановіч, М. І. Свістуновай. – Мн., 2018. – С. 364–373. – (Беларусіка = Albaruthenica ; кн. 38).

16–А. Лаўрык, Т. А. Публікацыі беларускага пісьменніка міжваеннага перыяду Вячаслава Адамовіча (Дзергача) на старонках беларускіх газет / Т. А. Лаўрык // Матэрыялы XVI Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў: да

500-годдзя заснавання Жыровіцкага манастыра і бібліятэкі, Мінск, 15 мая 2020 г. / Нац. б-ка Беларусі ; склад.: Т. А. Сапега [і інш.]. – Мн., 2020. – С. 203–207.

17–А. Лаўрык, Т. Вобраз Канстанціна Астрожскага ў мастацкай інтэрпрэтацыі беларускіх пісьменнікаў / Т. Лаўрык // Волинська книга: історія, дослідження, колекціонування : наук. зб. / Держ. історико-культур. заповідник, Музей кн. та друкарства. – Острог, 2020. – Вип. 4 : [Матеріали Четвертої наукової конференції «Волинська книга: історія, дослідження, колекціонування», 10 грудня 2020 р., м. Острога Рівненської області : до 35-річчя відкриття Музею кн. та друкарства Держ. історико-культур. заповідника м. Острога] / ред. група: М. Манько, С. Позіховська. – С. 148–153.

18–А. Лаўрык, Т. А. Аповесць «Салавей» Змітрака Бядулі ў водгуках пісьменнікаў 1920-х гадоў / Т. А. Лаўрык // Навукова-практычны семінар «Шляхамі маладнякоўцаў», Мінск, 27 студзеня 2021 г. / Нац. б-ка Беларусі [і інш.]. – [Мн., 2021]. – URL: https://conference.nlb.by/shljahami_maladnjakoucau/agenda/reports/Lauryk.pdf (дата звароту: 12.03.2025).

19–А. Лаўрык, Т. А. Элементы еўрапейскага рыцарскага рамана ў творах Л. Дайнекі «Меч князя Вячкі» і «Назаві сына Канстанцінам» / Т. А. Лаўрык // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : матэрыялы XIII Міжнар. навук. канф., прысвеч. 100-годдзю БДУ і 90-годдзю з дня нараджэння члена-карэспандэнта НАН Беларусі, праф. А. А. Лойкі, Мінск, 28–29 кастрычніка 2021 г. / Бел. дзярж. ун-т ; навук. рэд. А. І. Бельскі. – Мн., 2021. – С. 363–367.

20–А. Лаўрык, Т. А. Мастацкае ўвасабленне вобраза Льва Сапегі ў рамане Леаніда Дайнекі «Пра лісоўчыка, злога хлопчыка» / Т. А. Лаўрык // Віцебскі край. – Мн., 2022. – Т. 7 : Матэрыялы VII Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Віцебскі край», прысвечанай Году народнага адзінства, 25 лістапада 2021 г., Віцебск / Віцеб. абл. б-ка [і інш.] ; рэдкал.: Т. М. Адамян (гал. рэд.) [і інш.]. – С. 492–496.

21–А. Лаўрык, Т. А. Рэцэпцыя Берасцейскай уніі 1596 г. у творах беларускіх пісьменнікаў / Т. А. Лаўрык // Матэрыялы XVIII Міжнародных кнігазнаўчых чытанняў, Мінск, 28–29 красавіка 2022 г. / Нац. б-ка Беларусі ; склад.: Т. У. Карнілава, Г. У. Кірэева ; рэдкал.: А. Ю. Кніжнікава (старш.) [і інш.]. – Мн., 2022. – С. 113–118.

22–А. Лаўрык, Т. А. Полацкі Сафійскі сабор – сімвал улады і веры Усяслава Полацкага (паводле рамана Л. Дайнекі «След ваўкалака») / Т. А. Лаўрык // Віцебскі край. – Мн., 2025. – Т. 10 : матэрыялы X навук.-практ. канф. «Віцебскі край», прысвечанай 80-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і 1050-годдзю г. Віцебска, 21–22 лістап. 2024 г., Віцебск / Віцеб. абл. б-ка [і інш.] ; рэдкал.: Т. М. Адамян (гал. рэд.) [і інш.]. – С. 502–506.

## РЭЗЮМЭ

**ЛАЎРЫК**
**Таццяна Анатольеўна**

## ЭВАЛЮЦЫЯ ТВОРЧАЙ ІНДЫВІДУАЛЬНАСЦІ ЛЕАНІДА ДАЙНЕКІ Ў КАНТЭКСЦЕ МАСТАЦКАГА ГІСТАРЫЗМУ

**Ключавыя словы**: гістарычны раман, гістарычная проза, эвалюцыя творчай індывідуальнасці, жанрава-стылёвая спецыфіка, аўтарская стратэгія, хранатоп, цыкл раманаў, мегацыкл, мастацкія прыёмы

**Мэта даследавання**: на аснове сістэмна-комплекснага аналізу гістарычнай прозы Л. Дайнекі прасачыць станаўленне і эвалюцыю творчай індывідуальнасці пісьменніка ў кантэксце мастацкага гістарызму.

**Метады даследавання**: сістэмна-комплексны, біяграфічны, структурнага аналізу, параўнальна-тыпалагічны, гісторыка-храналагічны і культурна-гістарычны.

**Атрыманыя вынікі і іх навізна.** Дысертацыя з’яўляецца першым у беларускім літаратуразнаўстве гісторыка-храналагічным і сістэмна-комплексным даследаваннем творчай індывідуальнасці Л. Дайнекі ў аспекце фарміравання мастацкага гістарызму ў сучаснай беларускай літаратуры: абгрунтавана сцверджаны працэс жанрава-стылёвай эвалюцыі, мадэрнізацыйных тэндэнцый у творах пісьменніка ХХ – пачатку ХХІ ст., вылучана і ахарактарызавана іх мастацкая навізна, адметнасць і высокая мастацкая вартасць. Упершыню вызначаны асноўныя этапы станаўлення гістарычнай тэматыкі і праблематыкі ў творчасці Л. Дайнекі, акрэслены тэндэнцыі да пашырэння жанрава-тэматычных межаў яго раманнай прозы; прааналізаваны яго асобныя творы ХХІ ст., якія не атрымалі сістэмнага аналізу ў беларускім літаратуразнаўстве. Упершыню падрыхтаваны поўныя бібліяграфічныя спісы, якія адлюстроўваюць жыццёвы і творчы шлях Л. Дайнекі і з’яўляюцца каштоўным інструментам для цэласнага даследавання і вывучэння творчасці пісьменніка.

**Рэкамендацыі па выкарыстанні і галіна прымянення атрыманых вынікаў.** Матэрыялы даследавання могуць быць карысныя пры вывучэнні творчасці Л. Дайнекі ва ўстановах агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі, пры распрацоўцы спецсемінараў і спецкурсаў для студэнтаў філалагічных спецыяльнасцей; пры падрыхтоўцы дыпломных і курсавых работ, рэфератаў і дакладаў па сучаснай літаратуры на гістарычную тэматыку.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## РЕЗЮМЕ

**ЛАВРИК**
**Татьяна Анатольевна**

## ЭВОЛЮЦИЯ ТВОРЧЕСКОЙ ИНДИВИДУАЛЬНОСТИ ЛЕОНИДА ДАЙНЕКО В КОНТЕКСТЕ ХУДОЖЕСТВЕННОГО ИСТОРИЗМА

**Ключевые слова**: исторический роман, историческая проза, эволюция творческой индивидуальности, жанрово-стилевая специфика, авторская стратегия, хронотоп, цикл романов, мегацикл, художественные приемы

**Цель исследования**: на основе системно-комплексного анализа исторической прозы Л. Дайнеко проследить становление и эволюцию творческой индивидуальности писателя в контексте художественного историзма.

**Методы исследования**: системно-комплексный, биографический, структурного анализа, сравнительно-типологический, историко-хронологический, культурно-исторический.

**Полученные результаты и их новизна.** Диссертация является первым в белорусском литературоведении историко-хронологическим, системно-комплексным исследованием творческой индивидуальности Л. Дайнеко в аспекте формирования художественного историзма в современной белорусской литературе: обоснованно раскрывается процесс жанрово-стилистической эволюции, модернизационных тенденций в произведениях писателя XX – начала XXI в., выделена и охарактеризована их художественная новизна, самобытность и высокая художественная ценность. Впервые представлены основные этапы формирования исторической темы и проблематики в творчестве Л. Дайнеко, отмечены тенденции к расширению жанрово-тематических границ романной прозы писателя; проанализированы его отдельные произведения XXI в., которые не получили системного анализа в белорусском литературоведении. Впервые подготовлены полные библиографические списки, которые отражают жизненный и творческий путь Л. Дайнеко и являются ценным инструментом для дальнейших исследований и изучения творчества писателя.

**Рекомендации по использованию и область применения полученных результатов.** Материалы исследования могут быть полезны при изучении творчества Л. Дайнеко в учреждениях общего среднего и высшего образования; при разработке спецсеминаров и спецкурсов для студентов филологических специальностей; при подготовке дипломных и курсовых работ о современной литературе на историческую тематику.

ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

## SUMMARY

**LAURYK**
**Tatsyana Anatolievna**

## THE EVOLUTION OF LEANID DAJNIEKA’S CREATIVE INDIVIDUALITY IN THE CONTEXT OF ARTISTIC HISTORICISM

**Keywords**: historical novel, historical prose, evolution of creative individuality, genre and style specifics, author's strategy, chronotope, cycle of novels, megacycle, artistic techniques

**The research goal**: to trace the formation and evolution of L. Dajnieka's creative individuality in the context of artistic historicism on the basis of the system-complex analysis of the writer’s historical prose.

**Research methods**: systemic-comprehensive, biographical, structural analysis, comparative and typological, historical-chronological, cultural-historical.

**Obtained results and its novelty.** The dissertation is the first historical-chronological, systemic-comprehensive study in Belarusian literary studies of L. Dajnieka's creative individuality in the context of the formation of artistic historicism in contemporary Belarusian literature: it reasonably discloses the process of genre-stylistic evolution, as well as modernization tendencies in the writer’s works of the 20th and early 21st centuries, highlighting and characterizing their creative novelty, originality and high artistic value. For the first time, the main stages of the formation of historical theme and issues in the work of L. Dajnieka are presented, tendencies towards the expansion of the genre and thematic boundaries of the writer's novelistic prose are highlighted, and his selected works of the 21st century, which have not undergone systematic analysis in Belarusian literary criticism, are analysed. For the first time complete bibliographic lists have been prepared, which reflect the life and creative path of L. Dajnieka and are a valuable tool for further research and study of the writer’s work.

**Recommendations for use and scope of application of the obtained results.** The research materials can be useful in the study of the L. Dajnieka's work in institutions of secondary and higher education; in the development of special seminars and courses for students of philological specialties; in the preparation of diploma and course papers on modern literature on historical topics.



ОЗНАКОМИТЕЛЬНЫЙ ФРАГМЕНТ

Падпісана да друку 05.03.2026. Фармат 60×84 1/16 Папера афсетная.
Лічбавы друк. Ум. друк. арк. 1,63. Ул.-выд. арк. 1,75.
Тыраж 60 экз. Заказ 27.

Надрукавана з арыгінала-макета заказчыка
ў рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве
«Выдавецкі цэнтр Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/63 от 19.03.2014.
Вул. Чырвонаармейская, 6, 220030, Мінск.